Падтрымай "Вясну" на PATREON

# Узяліся за студэнтаў. У першы дзень восені працягваюцца затрыманні фота відэа дапоўнена

01.09.2020 **Тэгі**: пераслед, свабода мірных сходаў, затрыманні




Амап каля Лінгвістычнага універсітэту.

Раніца 1 верасня ў Мінску азмрочылася затрыманнямі грамадзян і студэнтаў. У гэты дзень у многіх гарадах Беларусі адбываюцца мірныя пратэсты супраць фальсіфікацыі выбараў і жорскіх разгонаў акцый у паслявыбарчы перыяд.

Студэнты і выкладчыкі БДУІР рыхтуюць зварот да ўладаў, а калона студэнтаў Беларускага нацыянальнага тэхнічнага універсітэта рушыла ў цэнтр Мінска, да яе далучаюцца студэнты іншых ВНУ.

Так  на вуліцы Мсціслаўца каля 8-40 невядомыя запхнулі ў аўто проста на вуліцы **Кавальчук Любоў** і звезлі ў невядомым накірунку. Жанчына збірала подпісы за адкліканне дэпутата ў сваёй акрузе. Пазней стала вядома, што жанчыне прысудзілі штраф у памеры 10 базавых велічынь нібыта за ўдзел у несанкцыянаавным масавым мерапрыемстве.



TUT.BY - навіны ў тэлеграм-канале паведамілі, што каля вучэбнага корпусу БНТУ былі затрыманыя двое студэнтаў.  Прозвішчы затрыманых  - **Уладзіслаў Стасевіч**  і **Вікторыя Гранкоўская.**

У Мінску з працы супрацоўнікі міліцыі забралі **Алега Мазгова**, дома праводзіцца ператрус. Сябры Мазгова звязваюць гэта з размяшчэннем відэаролікаў на ютубе і ўдзеле акцыях пратэсту 9 жніўня.

Журналістаў "Еўрарадыё", якія вялі стрым са студэнцкай акцыі пратэсту, затрымалі ў жывым эфіры: журналістка **Марыя Вайтовіч** і  **Раман Гадун** (Беларусы і Рынак).

Затрыманы яшчэ адзін студэнт - **Дзмітрый Астроўскі.** Затрыманы на супрацьлеглым баку ад БДЭУ. Пад'ехаў сіні бус і яго забралі.

Паведамляюць, што АМАП затрымаў некалькі дзясяткаў студэнтаў на плошчы Перамогі і разагнаў калону пратэстуючых студэнтаў. Акрамя студэнтаў затрыманы былі жуналісты і іншыя людзі.

# Спіс затрыманых за 1 верасня ў Мінску:

1. **Астроўскі Дзмітрый**
2. **Стасевіч Уладзіслаў,** дастаўлены ў Савецкі РУУС
3. **Гранкоўская Вікторыя** (сірата), дастаўлены ў Савецкі РУУС
4. **Самуйлаў Раман Ігаравіч,** дастаўлены ў Савецкі РУУС
5. **Марыя Вайтовіч** - журналістка, адпусцілі
6. **Раман Гадун** - журналіст, адпусцілі
7. **Кузьміч Алег Андрэевіч**
8. **Крыванос Дзмітрый,** дастаўлены ў Савецкі РУУС
9. **Шулюк Дзмітрый**
10. **Вадзім Белявец,** выкладчык гістфак БДУ, пазней стала вядома што яго вызвалілі.
11. **Зарэ Севасцьян,** дастаўлены ў Савецкі РУУС
12. **Шаўчэнка Глеб Юр'евіч**, дастаўлены ў Маскоўскі РУУС
13. **Бабіч Арцём**
14. **Шэрышэўская Марыя,** затрыманая каля БДЭУ, дастаўленая ў Заводскі РУУС
15. **Гаўрыленка Ангеліна Уладзіміраўна,** затрыманнем кіраваў падпалкоўнік міліцыі **Бандаровіч Аляксей Сцяпанавіч**, асабісты нумар А01207
16. **Савіч Андрэй Генадзьевіч**
17. **Высоцкі Арсен Вячаслававіч**
18. **Мацюшэўскі Максім Уладзіміравіч**
19. **Пятровіч Аляксандр**
20. **Кліцуноў Багдан Аляксеевіч**
21. **Нікіфарава Вольга Аляксандраўна**
22. **Пузырок Сяргей Аляксандравіч**
23. **Каліноўская Дыяна Міхайлаўна**
24. **Шкрабава Аляксандра**
25. **Аніферык Ягор** - адпусцілі ноччу з Ленінскага РУУС
26. **Жарын Кірыл**
27. **Дзевалтоўскі-Гінтаўт Арсен Андрэевіч**
28. **Скрыцкі Павел Александравіч**
29. **Сасункевіч Сяргей Аляксеевіч**
30. **Неўдах Сяргей**

31. **Барысава Караліна**
32. **Ільюкевіч Канстанцін**
33. **Сенько Ільля**
34. **Дзенісенка Яўген** (непаўнагадовы)
35. **Дарафееў Даніл**
36. **Данііл Ярмалкевіч,** затрыманы каля Ліцэя БДУ
37. **Калабук Дзмітрый**
38. **Субоцін Ягор,**
39. **Трус Аляксей**, затрыманы каля Ліцэя БДУ, адпусцілі ноччу, перапісалі дадзеныя
40. **Сінюк Зміцер**
41. **Шляхценка Пётр**
42. **Шуляк Ягор**
43. **Забаўскі Анатоль**
44. **Гладчанка Станіслаў,** затрыманы ў раёне МТЗ
45. **Ісачанка Уладзіслаў,** затрыманы ў раёне МТЗ
46. **Астроўскі Мікіта** - вызвалены
47. **Плужнікава Ксенія,** затрыманая ў раёне МТЗ
48. **Смаляк Іван**
49. **Шаўлюга Аляксей,** пазаштатны карэспандэнт БелаПАН
50. **Кавальчук Любоў** - вызвалена, аштрафавалі на 10 б.в. за ўдзел у акцыі.
51. **Гаўрыловіч Юрый**
52. **Бартніцкі Ян**
53. **Карпінчык Данііл**
54. фатограф "Комсомольской правды" **Святаслаў Зоркі**
55. аператар "Комсомольской правды" **Мікіта Недаверкаў**

56. карэспандэнт "Комсомольской правды" **Марыя Элешэвіч.**

57. Журналіст TUT.BY **Надзея Калініна**

58. Журналіст **Аляксей Суднікаў**

59. фрылансер **Васіль Сямашка.**

60. **Казленя Сяргей**
61. **Моніна Вера**
62. **Шведаў Аляксандр**
63. **Фядотаў Сямён**
64. **Кавалёў Валерый**
65. **Базылька Алег**
66. **Шчарбакоў Павел**
67. **Кастраміч Юлія**
68. **Картошнікаў Дзмітрый**
69. **Герашчанка Антон**
70. **Шукаловіч Аляксей**
71. **Карзюк Глеб**
72. **Крамсаеў Уладзімір** - вызвалены
73. **Волчак Міхась**
74. **Мухамор Андрэй**
75. **Ермаловіч Святлана**
76. **Ганічаў Серафім**
77. **Вячаслаў Быкоўскі**
78. **Бандарэнка Ігар** - у ІЧУ на вул. Акрэсціна
79. **Сталяр Алег**
80. **Хадаркевіч Станіслаў**
81. **Зенчанка Мікіта**




## Магілёў

У Магілёве затрымалі аднаго з лідэраў пратэставага руху **Валадара Цурпанава**. Актывіст прыйшоў на лінейку ў 43-ю мясцовую школу, каб заклікаць пэдагогаў, якія працавалі ў выбарчых камісіях, прызнаць фальсіфікацыі выбараў і «пакаяцца». Там яго і затрымалі. Цяпер ён у Кастрычніцкім аддзеле міліцыі.

Раней на Валадара Цурпанава склалі пратакол за арганізацыю 23 жніўня несанкцыянаванага пікету на плошчы Леніна.

## Калінкавічы

Тут пасля лінейкі ў гімназіі затрымалі маці і мастачку **Марыну Міхееву.** Жанчыну абвінавацілі ў хуліганстве і ўдзеле ў несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве.

## Гомель

У Гомелі каля Цэнтральнага універмага 1 верасня быў затрыманы **Дзяніс Гаўрыленка.**.. 1995 года нараджэння.

**Інфармацыя будзе дапаўняцца.**

***Калі вас ці вашых блізкіх затрымалі, паведамляйце нам праз тэлеграм-бот @viasna_bot ці на гарачую лінію:***

- **+375 29 543 38 66** (у тым ліку Viber)
- **@ViasnaSOS** - тэлеграм
- **+ 375 17 377 55 40**

Кантакты рэгіянальных прадстаўнікоў "Вясны"

Твитнуть






## СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

Чатырох жыхароў Паставаў асудзілі да "хатняй хіміі" за фотаздымак з Маршу (дапоўнена)

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 20 палітычных зняволеных

## ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класкоўская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17



ГАЛОЎНАЕ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

## АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі трэмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі

Да пяці гадоў калоніі. Асудзілі палітвязняў, якія вывесілі нацыянальныя сцягі Беларусі і Украіны

Дайджэст вызваленых: 12 палітвязняў у сакавіку цалкам адбылі тэрміны і выйшлі на волю

"Могуць з'яўляцца злачынствамі супраць чалавечнасці". Што азначае гэтая фармулёўка ў дакладзе

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

## Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

## Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ



‹ ›




## ПАРТНЁРСТВА

- Рацыя
- kamunikat — Беларуская інтэрнэт-бібліятэка
- ВЫТОКІ
- ADC memorial — Anti-Discrimination Centre
- МХГ — Московская Хельсинкская Группа
- AMNESTY INTERNATIONAL
- Міжнародны камітэт па расследаванні катаванняў у Беларусі
- Беларуская асацыяцыя журналістаў — baj.by

## СЯБРОЎСТВА

- ENEMO — European Network of Election Monitoring Organizations
- HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK
- fidh

VOICE OF BELARUS

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY